– выхоўваць гонар і павагу да дзяржаўных сімвалаў; фарміраваць уяўленні аб значэнні дзяржаўных герба, сцяга і гімна;

– развіваць дапытлівасць да месца або аб'екта, якія з'яўляюцца гістарычнай спадчынай, архітэктурнай каштоўнасцю ў сваім пасёлку ці горадзе, сталіцы краіны;

– пашыраць веды аб тым, як жывуць, працуюць і аддыхаюць людзі ў Беларусі;

– вучыць усведамляць урачыстасць дзяржаўных свят; фармаваць культуру паважлівага стаўлення да нацыянальных традыцый і абрадаў, датычнасць да сучасных падзей [2].

Пачуццё Радзімы пачынаецца ў дзіцяці з яго стаўлення да сям'і, да найбліжэйшых людзей - да маці, бацькі, бабулі, дзядулі. Таму асаблівая роля ў выхаванні патрыятызму адводзіцца сям'і, дзе яно засноўваецца на духоўнай сувязі паміж пакаленнямі, уключае ў сябе фарміраванне патрыятычных пачуццяў і патрыятычных паводзін.

Сямейнае патрыятычнае выхаванне павінна быць мэтанакіраваным, паслядоўным, своечасовым і працягвацца на ўсіх этапах станаўлення высокамаральнай, гарманічна развітой асобы [1].

Каб выхаваць пачуццё патрыятызму ў дзяцей дашкольнага ўзросту, педагогі мусяць выкарыстоўваць розныя формы і метады арганізацыі дзейнасці дзяцей. У сваёй працы педагогі могуць выкарыстоўваць наступныя метады:

– назіранне (напрыклад, бачыць змены ў абліччы дзіцячага сада, вуліцы, гарады і г.д.)

– гутаркі з дзецьмі аб краіне, родным горадзе;

– выкарыстанне дзіцячых мастацкіх твораў, рэпрадукцый карцін (іх разгляданне і абмеркаванне);

–развучванне з дзецьмі песень, вершаў, прыказак, прымавак, чытанне казак, праслухоўванне музычных твораў, рухомых гульняў;

– знаёмства дзяцей з нацыянальнай культурай Рэспублікі Беларусь;

– асабісты прыклад выхавацеля, які любіць сваю працу, сваю вуліцу, свой горад, і прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці краіны [3].

**Заключэнне.** Такім чынам, вырашэнне праблемы выхавання патрыятызму дзяцей дашкольнага ўзросту на сённяшні дзень з'яўляецца цяжкай задачай, што звязана, перш за ўсё, з асаблівасцямі дашкольнага ўзросту.

Але хочацца адзначыць, што дзіцячае ўспрыманне - самае дакладнае, а дзіцячыя ўражанні - самыя яркія. Сёння расце новае дзіўнае пакаленне, якое, у адрозненне ад нас, дарослых, успрымае навакольную рэчаіснасць са значна большай зацікаўленасцю.

1. Лутавінаў, В.І. Ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі: новыя выклікі, патрабаванні і напрамкі развіцця / В.І. Лутавінаў. - Тэкст: непасрэдны // Выхаванне школьнікаў. – 2019. – № 8. – С. 3–10.

2. Суддзіна, Л. В. Патрыятызм - складнік грамадзянскай ідэнтычнасці асобы / Л.В. Суддзіна. - Тэкст: непасрэдны // Класны кіраўнік. – 2020. – № 6. – С. 49–60. – Бібліягр.: с. 55 (4 назв.).

3. Маханева, М.Д. Маральна-патрыятычнае выхаванне дзяцей малодшага ўзросту - М.: АРКТЫ, 2004. - 69 с.

4. Аверына, Н.Г. А духоўна-маральным выхаванні малодшых школьнікаў. Пачатковая школа // Пачатковая школа. – 2011. – №11. – С.68 – 71.

## ВЫКАРЫСТАННЕ СРОДКАЎ ВІЗУАЛІЗАЦЫІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ І ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

*Н.В. Крыцкая[1], Т.С. Шынкарэнка[2]*
*[1]Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*
*[2]Чашнікі, ДУА "Сярэдняя школа № 4"*

У наш час усё ўвага надаецца спалучэнню разнастайных арганізацыйных формаў і сродкаў навучання, якія дазваляюць больш эфектыўна вырашаць адукацыйныя задачы, улічваючы ўзроставыя асаблівасці навучэнцаў, разумнае спалучэнне рацыянальнага і эмацыйнага ў выкладанні.

Адной з такіх актуальных праблем і з'яўляецца запатрабаванне выкарыстання новых тэхналогій у навучанні. Неабходна шукаць новыя форы правядзення заняткаў у пачатковых класах, якія б развівалі ў малодхых школьнікаў гаворку, памяць, увагу, творчае ўяўленне, назіральнасць.

Настаўніку часта даводзіцца мець справу з рознымі формамі прадстаўлення інфармацыі, у тым ліку і інфармацыі ў візуальнай форме.

Чаму дзіцячыя кнігі і падручнікі ілюстраваны? Дзеці ўтрымліваюць у памяці толькі 10% таго, што чытаюць, 30% таго, што бачаць, і больш за палову таго, што бачаць і чуюць.

Мэта дадзенай публікацыі – паказаць эффектыўнасць выкарыстання візуальных сродкаў навучання на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чыьання.

**Матэрыял і метады.** Метадалагічную базу даследавання складаюць працы айчынных і замежных навукоўцаў, метадыстаў і педагогаў. У артыкуле выкарыстоўваліся метад вывучэння навукова-метадычнай літаратуры па праблеме даследавання, метад абагульнення, метад педагагічнага назірання за вучэбным працэсам, метад анкетавання. Эксперыментальнае даследаванне праводзілася на базе ДУА «Сярэдняя школа № 4 г. Чашнікі». У працы прынялі ўдзел 63 вучаня 3-х класаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** На сённяшні дзень вядома значная колькасць візуальных сродкаў перадачы інфармацыі: інтэрактыўная дошка, плакаты, схемы і мультымедыйны праектар, зборныя візуальныя сродкі, дэманстрацыйныя мадэлі.

Любая форма нагляднасці змяшчае элементы праблемнасці. Задача настаўніка – выкарыстоўваць такія формы навучання, якія не толькі дапоўнілі б слоўную інфармацыю, але і самі з'яўляліся носьбітамі інфармацыі. Чым больш праблемнасці ў нагляднай інфармацыі, тым вышэй ступень актыўнасці вучня. «Нагляднасць – гэта дэманстрацыя, а візуалізацыя – гэта калі вучні на аснове схемы, карты, калажу, малюнка супастаўляюць з’явы, факты, аналізуюць іх, шукаюць прычыннавыніковыя сувязі, робяць высновы. Калі літаратурныя вобразы, якія разглядаюцца, правакуюць вучняў задаваць пытанні, дыспутаваць» [1, 5].

Дзеці малодшага школьнага ўзросту любяць яркія, маляўнічыя карцінкі, кнігі з разнастайнымі малюнкамі. Яны прыцягваюць дзіця, прыкоўваюць яго ўвагу, і ў гэтым несумненны станоўчы эфект выкарыстання наглядных сродкаў навучання.

Эфектыўнасць навучання залежыць ад ступені прыцягнення да ўспрымання ўсіх органаў пачуццяў чалавека. Чым больш разнастайныя пачуццёвыя ўспрыманні навучальнага матэрыялу, тым больш трывала ён засвойваецца. Гэтая заканамернасць ужо даўно знайшла свой выраз у дыдактычным прынцыпе візуалізацыі. Назва гэтага прынцыпу паходзіць ад слоў – погляд, агляд, глядзець. Сродкі візуалізацыі павялічваюць цікавасць да ведаў, робяць працэс засваення лягчэйшым.

З вопыту работы мы прапануем настаўнікам на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання выкарыстоўваць наступныя заданні:

– «Збярыце вершык» – словы з невялікага па памеры верша, па якіх школьнікі павінны скласці поўны тэкст;

– «Слоўнікавыя словы» – можна выкарыстоўваць розныя варыянты дадзенага задання: воблака з аднаго слоўнікавага слова; воблака са слоўнікавых слоў у рамках адной вывучанай тэмы; воблака са слоў, вывучаных за год, і г.д.;

– «Складзіце сказ або тэкст», выказыстоўваючы як мага больш слоў з прапанаванага воблака;

– «Адгадайце прыказку (прымаўку, загадку)» – даецца большасць слоў з прыказкі, прымаўкі, загадкі, якія некалькі прапушчаны;

– «Збярыце імёны герояў» – малодшым школьникам прапануецца самім скласці воблака, дзе будуць выкарыстаны імёны герояў аднаго або некалькіх твораў.

Кросэнс – гэта асацыятыўная галаваломка, якая злучае ў сабе якасці адразу некалькіх інтэлектуальных забаў: галаваломкі, загадкі і рэбуса.

Кросэнс мае падабенства са словам «крыжаванка». Гэта не крыжаванка, але два падабенствы з ім ёсць: поле з клетак і неабходнасць паламаць галаву, каб яго вырашыць. Калі крыжаванка – гэта скрыжаванне слоў, то кросенс – гэта, хутчэй, скрыжаванне сэнсаў. Ен уяўляе сабой поле, якое складаецца з дзевяці квадратаў, у якіх змешчаныя малюнкі. Усе яны расстаўлены так, што кожнае папярэдняе звязана па сэнсе з наступным, а цэнтральнае аб'ядноўвае ўсё, з'яўляючыся ключавым словам, агульнай тэмай. Загадзя рыхтуецца поле, дзе нагляднасць расстаўляюцца ў пэўнай паслядоўнасці. Задача навучэнцаў – «разгадаць кросенс», улавіць ланцужок і скласці апавяданне.

Чытаць кросенс трэба зверху ўніз і злева направа (як традыцыйнае чытанне), далей трэба рухацца толькі наперад і заканчваць на цэнтральным пятым квадраце. Такім чынам атрымліваецца ланцужок загорнуты як слімак (улітка). Пачаць можна як з першага, так і з любога вядомага малюнка. Можна пранумараваць клеткі загадзя, каб дзеці не заблыталіся. Вучні павінны зразумець яго сэнс, крыху расказаць пра яго, далей устанавіць лагічную сувязь з наступным малюнкам, таксама распавесці пра яго. І гэтак далей, пакуль не дабяруцца да цэнтральнага квадрата, і не завершаць сваё апавяданне самым галоўным фактам.

Метад кросенсу дапамагае развіваць крытычнае і лагічнае мысленне малодшых школьнікаў, арганізоўваць работу ў групах, рабіць урокі беарускай мовы і літаратурнага чытання цікавейшымі і спрыяе лепшаму засваенню і запамінанню матэрыяла.

**Заключэнне.** Выкарыстанне візуальных сродкаў і метадаў у адукацыйным працэсе садзейнічае актывізацыі разумовай і пазнавальнай дзейнасці. У школьнікаў павялічваецца дапытлівасць і цікавасць да творчай дзейнасці, інтэнсіўна развіваюцца ўсе псіхічныя працэсы, крэатыўнасць і ініцыятыўнасць. Аднак такая інфармацыя не можа зводзіцца проста да дэманстрацыі, яна павінна актывізаваць навучальна-пазнавальную дзейнасць малодшых школьнікаў. Такі падыход патрабуе ад выкладчыка змены традыцыйных наглядных сродкаў навучання.

1. Дубоўская, В. Візуалізацыя як правакацыя / В. Дубоўская // Настаўніцкая газета. – 22 студзеня 2022. - С. 5–7.
2. Лапшева, Е.Е., Храмова М. В. Развитие визуальной грамотности обучаемых средствами информационно – коммуникационных технологий// Психолого-педагогический журнал Гаудеамус. – 2011. – №18. – С.53–56.

## АСНОВЫ ФАРМІРАВАННЯ ЭКАЛАГІЧНЫХ УЯЎЛЕННЯЎ ПРА ЖЫВЁЛ, ЗАНЕСЕНЫХ У ЧЫРВОНУЮ КНІГУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ, У ДЗЯЦЕЙ У ІНТЭГРАВАНАЙ ГРУПЕ

*Т.С. Кухарэнка, Н.В. Амасовіч, Ж.П. Чобат*
*Віцебск, ВДУ імя П. М. Машэрава*

Экалагічная сітуацыя ў свеце і ў Рэспубліцы Беларусь вызначае вострую неабходнасць у фарміраванні экалагічнай культуры асобы. У Кодэксе “Аб адукацыі Рэспублікі Беларусь” экалагічная накіраванасць адукацыі ўведзена ў ранг прынцыпу дзяржаўнай палітыкі, якая прадугледжвае фарміраванне экалагічнай свядомасці, экалагічнай культуры асобы дзіцяці [1].

Праблеме фарміравання уяўленняў пра жывёл прысвечана нямала даследаванняў С.Н. Нікалаявай, П.Г. Самарукавай і інш. вядомыя таксама працы Л.П. Моладавай, І.А. Камаровай, О.О. Пракопавай, А.А. Петрыкевіч і інш., якія распрацавалі агульнатэарэтычныя і метадалагічныя аспекты экалагічнай адукацыі дашкольнікаў. Шляхі станаўлення ўсвядомленага, беражлівага і клапатлівага стаўлення да прыроды ў дзяцей дашкольнага ўзросту разглядаліся ў даследаваннях В.П. Арсенцьевай, В.Г. Грэцовай, Е.І. Золатавай, М.К. Ібраімавай, І.А. Камаровай, А.А. Петрыкевіч і інш. Важныя пытанні закрануты ў кнізе «Родны край» Р.Г. Жукоўскай у якой прапануецца методыка азнаямлення дзяцей з родным краем, з падзеямі і з'явамі грамадскага жыцця. Каштоўны матэрыял, цікавыя заняткі, гульні змяшчаюцца ў кнігах “Экалагічныя заняткі з дзецьмі” Т.М. Бандарэнка і “Сардэчна запрашаем у экалогію!” В.А. Варанкевіч. У іх прадстаўлены канспекты заняткаў па азнаямленні дашкольнікаў з Чырвонай кнігай [2; 3].

Аналіз літаратуры па праблеме даследавання паказаў, што на сённяшні дзень недастаткова распрацовак у галіне азнаямлення дзяцей дашкольнага ўзросту з жывёламі Рэспублікі Беларусь, занесенымі ў Чырвоную кнігу. Важнасць і актуальнасць разгляданай праблемы вызначылі выбар тэмы даследавання.

Мэта даследавання – вызначыць асаблівасці фарміравання экалагічных уяўленняў пра жывёл, занесеных у чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь, у дзяцей у інтэграванай групе.

**Матэрыял і метады.** Даследаванне праводзілася на базе ДУА «Яслі-сад № 89 г. Віцебска» і ДУА «Яслі-сад №11 аграгарадка Малыя Славені, Шклоўскага раёна». Пры правядзенні